УДК 82.09+801.81

**С. М. Тычына,**

*кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай і замежнай філалогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», Мінск, Беларусь*

# МАСТАЦКАЯ СПЕЦЫФІКА ПАКАЗУ ПСІХІЧНЫХ ПРАБЛЕМ У ТВОРАХ «ВАЎКАЛАК» Я. БАРШЧЭЎСКАГА І «ЧОРНЫ КОТ» Э. А. ПО

**Анатацыя.** На прыкладзе твораў Я. Баршчэўскага «Ваўкалак» і Э. А. По «Чорны кот» даследуецца праяўленне псіхалагізму ў рамантычнай літаратуры XIX ст. Адзначаецца, што ў творах прасочваецца яўнае падабенства, якое выражаецца праз паказ прыступаў некантралюемай агрэсіі і акцэнт на эмоцыях герояў, а таксама праз сувязь вобразаў, якія сустракаюцца ў творах, з фальклорам, праз зітаванасць вобразаў чалавека і звера і праз структурнае падабенства.

**Ключавыя словы:** рамантычная літаратура, псіхалагізм, фальклор, эмоцыі, прыступ некантралюемай агрэсіі, псіхічныя праблемы, ваўкалак.

**S. Tychina,**

*PhD in Philology, Associate Professor of the Department of Belarusian and Foreign Philology of the Educational Institution "Belarusian State University of Culture and Arts", Minsk, Belarus*

# ARTISTIC SPECIFICITY OF SHOWING MENTAL PROBLEMS IN THE WORKS "THE WEREWOLF" BY J. BARSCHEVSKY AND "THE BLACK CAT" E. A. POE

**Abstract.** The article examines the manifestation of psychologism in romantic literature of the 19$^{th}$ century using the works of J. Barschevsky "The Werewolf" and E.A. Poe "The Black Cat" as examples. It is noted that the works show a clear similarity, which is expressed through the display of attacks of uncontrolled aggression, through an emphasis on the emotions of the heroes, through the connection of images that are found in the works with folklore, through the connection of images of man and beast and through structural similarity.

**Keywords:** romantic literature, psychologism, folklore, emotions, attack of uncontrolled aggression, mental problems, werewolf.

Псіхалагізм з'яўляецца адной з яскравых рыс рамантычнай літаратуры XIX ст. Пісьменнікі-рамантыкі не проста цікавіліся душэўным станам і перажываннямі чалавека, але і спрабавалі паглыбіцца ў таемныя сферы падсвядомасці, апісваючы ў творах спецыфічныя паводзіны, выкліканыя псіхалагічнымі праблемамі, псіхічныя захворванні і фобіі. Персанажы рамантычных твораў не такія, як усе, выключныя, незвычайныя, дзіўныя. Адпаведна і паводзіны многіх герояў дзіўныя з пункту погляду іншых персанажаў. Рамантычны герой мае больш

тонкую душэўную арганізацыю ў параўнанні з большасцю людзей, часта ён – творчая асоба, якая спасцігае свет пры дапамозе пачуццяў, а таксама нейкага спецыфічнага нестандартнага бачання, якое знаходзіцца на мяжы вар'яцтва і прасвятлення. Самота рамантычнага персанажа часта звязана з яго псіхічнымі асаблівасцямі, якія выклікаюць у людзей страх, жаданне трымацца ад такога чалавека далей, а таксама з немагчымасцю ўстанавіць кантакт з іншымі людзьмі (сацыяльная, эмацыянальная ізаляцыя). Адсюль і часты мастацкі прыём у рамантычнай літаратуры – раздваенне асобы персанажа (у тым ліку існаванне персанажа адначасова ў розных светах – рэальным і фантастычным), які вымушаны хаваць фобіі, перажыванні і наогул сапраўдную сутнасць ад іншых.

Пісьменнікі XIX ст. не выстаўляюць дыягназы (што не дзіўна, улічваючы той факт, у якім стане на той час было вывучэнне псіхалогіі і псіхіятрыі), а псіхічныя праблемы часта ў мастацкім тэксце прадстаўлены праз пэўныя вобразы, якія могуць трактавацца па-рознаму. У якасці прыкладу можна прывесці твор Я. Баршчэўскага «Ваўкалак» (адно з апавяданняў празаічнага зборніка «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях») і навелу Э. А. По «Чорны кот». Ператварэнне ў ваўкалака ў апавяданні беларускага пісьменніка можна ўспрымаць па-рознаму: 1) літаральна і 2) сімвалічна.

1. Галоўны герой Марка пад уздзеяннем чарадзейства ператвараецца ў звера. Падобнае пераўтварэнне, несумненна, было пазычанае пісьменнікам з народнага ўяўлення пра тое, што чалавек можа стаць ваўкалакам. Згодна з даследаваннямі П. Шпілеўскага, беларусы вылучаюць два віды ваўкалакаў: «Да першага адносяцца Ваўкалакі-знахары, да другога – няшчасныя ахвяры» [2, с. 15]. З пункту погляду літаральнага ўспрымання тэксту Я. Баршчэўскага Марка становіцца ваўкалакам не па сваёй волі: гэта адбываецца пад уплывам зачараванай гарэлкі. Аднак вобраз героя зусім не адпавядае фальклорнаму вобразу ахвяры: «Кажуць, што гэтыя Ваўкалакі зусім ручныя, як хатнія жывёлы, выюць вельмі жаласліва ці то па-воўчы, ці то па-сабачы, а часта глуха стогнуць, як цяжка хворыя людзі, таму што, нягледзячы на ператварэнне ў ваўкоў, яны не губляюць чалавечых пачуццяў і нават некаторай свядомасці» [Там жа]. Даследчык М. Нікіфароўскі адзначае, што падобныя ваўкалакі нават імкнуцца трапіць пад удары палак і часта з'яўляюцца вегетарыянцамі («харчуюцца выключна раслiннаю ежай» [Там жа, с. 19]). Марка ж агрэсіўны, злы, робіць людзям шмат шкоды: «Расла мая нянавісць да людзей /.../. Вырашыў я шкодзіць ім ва ўсім, як яны шкодзяць адзін аднаму пры зручным выпадку, абы толькі мець сабе карысць. Дык нападаў, калі толькі можна было, на іх жывёлу і свойскіх птушак; нішчыў дашчэнту» [1, с. 130]. Такім чынам, Марка, якога гвалтоўна ператварылі ў ваўкалака, паводзіць сябе не як ахвяра, а як той, хто, згодна з народнымі ўяўленнямі,

ператвараецца сам (знахар, чараўнік), бо менавіта такія ваўкалакі «робяцца таксама драпежнымі і крыважэрнымі, як і сапраўдныя ваўкі, нават больш драпежныя за іх, таму што Ваўкалакі не столькі нападаюць на свойскую жывёлу і душаць яе, як ваўкі звычайныя, колькі на людзей, асабліва маладых і пераважна на дзяцей» [1, с. 15]. Нагадаем, што Марка здзяйсняе жудаснае злачынства, калі выкрадае дзяўчынку і становіцца прычынай яе гібелі (тое, што яна ператвараецца ў котку і жыве ў Аксінні, практычна паказвае тое, што яна завісае паміж «тым» і «гэтым» светамі). Чаму ж у Я. Баршчэўскага Марка сваімі паводзінамі не адпавядае фальклорнаму вобразу ахвяры? Верагодна таму, што літаральнае ператварэнне ў ваўкалака добра ўспрымаецца ў першую чаргу пры павярхоўным прачытанні тэксту. Аднак, калі паспрабаваць прааналізаваць вобраз Маркі больш глыбока, то можа ўзнікнуць думка пра іншую трактоўку.

2. Ператварэнне Маркі з'яўляецца адлюстраваннем яго душэўных праблем. На вяселле галоўны герой прыйшоў не проста расстроеным і ўзлаваным на тых, хто яго пакрыўдзіў (Ілля, пан). Фактычна ён быў узлаваны на ўсіх, нават тых, хто да яго няшчасцяў не меў ніякага дачынення (як, напрыклад, жанчына з дзіцём, якіх ён сустрэў па дарозе і на якіх зірнуў так, што кабета спалохалася). Яго злосць выклікана тым, што яго боль ніхто не разумее і не спачувае яму (суседзі смяяліся з яго няшчасця, людзі на вяселлі гулялі і атрымлівалі задавальненне ад свята, у той час, як герою было вельмі цяжка). Адсюль прыступы некантралюемай агрэсіі ў галоўнага героя, што сімвалічна прадстаўлена ў творы праз вобраз звера. Дзікі звер (воўк) не любіць людзей, пазбягае іх ці агрэсіўна абараняецца ад іх, бо бачыць у іх ворагаў. Адпаведна галоўны герой, які пачынае адчуваць усёпаглынальную нянавісць да людзей, губляе аблічча чалавека, перастае быць чалавекам.

Апавяданне Я. Баршчэўскага ў першую чаргу перадае не падзеі, а пачуцці, перажыванні галоўнага героя. Ваўкалак – сімвал злосці, нянавісці, адсутнасці кантролю, агрэсіі. Сны (Маркі) яшчэ больш падкрэсліваюць псіхалагічны стан героя, перадаюць яго мары, фантазіі і фобіі. Агрэсія, якая не паддаецца кантролю, ператварае героя ў звера, а спачуванне, спагада, літасць да людзей, раскаянне і г. д. вяртаюць чалавечае аблічча. Цікава, што ў творы сустракаецца таксама і анахарэтства (псіхапаталагічны сімптом, які праяўляецца праз імкненне да дабраахвотнай самаізаляцыі, праз жаданне абарваць кантакты з людзьмі і пазбяганне грамадскай дзейнасці). Калі Марка ператварыўся назад у чалавека, ён не вярнуўся да былога жыцця: «...ніколі не бачылі яго вясёлым, заўсёды маркоціўся, быў неспакойны, быццам штосьці страціў; любая грамада была яму не да душы. Калі людзі ідуць на кірмаш, пагуляць, паскакаць або збіраюцца ў вольны дзень на ігрышча ў карчму, дык ён, самотны, заўсёды ці то

ў хаце, ці то блукае дзе-небудзь у полі – задумлівы і журботны» [1, с. 127].

Звернем увагу на яшчэ адзін факт: ператварэнне Маркі адбылося пад уздзеяннем гарэлкі, якую яму прапанаваў дудар Арцём. Такім чынам, стан ваўкалака быў справакаваны не толькі злосцю, але і алкаголем, які, магчыма, і выклікаў тое, што герой страціў кантроль. Цікава, што падобную карціну можна назіраць у навеле Э. А. По «Чорны кот». У гэтым творы таксама паказаны прыступ некантралюемай агрэсіі, які выкліканы алкагалізмам галоўнага героя (імя героя не названа).

Наогул твор «Ваўкалак» Я. Баршчэўскага мае шмат агульнага з творам «Чорны кот» Э. А. По. Вылучым некалькі момантаў:

1. Сувязь з народнымі ўяўленнямі. Чорны кот у творы з'яўляецца ўвасабленнем містычных сіл, якія нясуць няшчасці і караюць галоўнага героя за яго злачынствы. Пры гэтым чорны кот, які спрыяе здзяйсненню справядлівай расплаты, не паказаны, як адлюстраванне дабра. Чорны кот – злавесны, страшны, ненавісны. Жонка галоўнага героя намякае на народныя перакананні, адпаведна якім чорны кот – гэта пярэварацень. З катом (дакладней, з двума катамі, якія выглядаюць як двайнікі) звязаныя містычныя падзеі (адбітак на сцяне ў выглядзе ката, узнікненне ката як з паветра і г. д.).

2. Знітаванасць паміж вобразамі чалавека і звера. Як і ў творы «Ваўкалак» звер з'яўляецца адлюстраваннем душы героя, яго перажыванняў (у навеле чорны кот сімвалізуе сумленне героя, ад якога немагчыма пазбавіцца).

3. Паказ прыступаў некантралюемай агрэсіі, з-за якіх героі здзяйсняюць злачынствы (ваўкалак выкрадае і кідае ў лесе дзіця, герой навелы «Чорны кот» крыўдзіць хатніх жывёл, выразае ў ката вока, а потым вешае яго, забівае сваю жонку). Прычым іх ахвярамі становяцца безабаронныя істоты і людзі.

4. Акцэнт на эмоцыях. Марка ў апавяданні Я. Баршчэўскага перажывае спектр эмоцый: радасць, шчасце, боль, адчай, злосць, нянавісць, страх, пачуццё віны і г. д. Герой навелы Э. А. По таксама жыве эмоцыямі. Аўтар не ўдакладняе, чым займаецца герой, кім працуе і г. д., але падрабязна апісвае тое, што герой адчувае (боль, віна, злосць, нянавісць і г. д. – тыя ж эмоцыі, што і ў Маркі). Цікава, што амерыканскі пісьменнік падкрэслівае ў канцы твора ўяўную безэмацыянальнасць героя (нібыта герой нічога не адчувае пасля забойства жонкі, не раскайваецца), аднак яго сапраўдныя пачуцці адкрываюцца, калі герой сам паказвае паліцэйскім, дзе схаваны труп.

5. Дэманстрацыя ў пачатку твора «смерці» героя (канец твора становіцца яго пачаткам). У навеле «Чорны кот» герой, перш чым расказаць сваю гісторыю, удакладняе, што заўтра яго чакае смерць (гэта яго прысуд за злачынства). Марка таксама згадвае, што «памёр

я для свету» [1, с. 127]. У творы Я. Баршчэўскага маецца на ўвазе духоўная смерць, як пакаранне за тое зло, якое герой учыніў, а таксама як вынік тых пакут, якія ён перанёс.

Такім чынам, у мастацкай літаратуры задоўга да навуковых падрабязных даследаванняў у вобласці псіхалогіі і псіхіятрыі пачалі апісваць унутраныя праблемы людзей. Пісьменнікі-рамантыкі пры гэтым часта звярталіся да фальклорных вобразаў, у якіх бачылі не столькі ўвасабленне забабонаў і перакананняў продкаў, колькі магчымасці адлюстраваць душэўныя перажыванні асобы.


1. *Баршчэўскі, Я.* Выбраныя творы / Я. Баршчэўскі // Уклад., прадм. і камент. М. Хаўстовіча. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 1998. – 480 с.

2. *Васілевіч, У. А.* Міфы бацькаўшчыны / У. А. Васілевіч // Беларуская Энцыклапедыя ; уклад. У. А. Васілевіч. – Мінск : БелЭн, 1994. – 109 с.


УДК 75.049.6(476)


**Я. В. Федорец,**

*кандидат искусствоведения, учитель высшей квалификационной категории государственного учреждения образования «Детская школа искусств № 3 г. Витебска «Маладик», Витебск, Беларусь*


## РЕМИНИСЦЕНЦИИ В СОВРЕМЕННОМ БЕЛОРУССКОМ НАТЮРМОРТЕ


**Аннотация.** Статья посвящена анализу реминисценций в современных живописных произведениях на примере натюрмортов белорусских художников, выполненных в период 2000-х – начала 2020-х гг. Исследование позволит более детально рассмотреть особенности и характер проявления данного приема в образно-пластической структуре картины, мировоззрение живописцев в эпоху постмодернизма. Наиболее выразительно реминисценции показаны в картинах таких авторов, как А. Скоробогатая, А. Доманов, А. Некрашевич, А. Петкевич, В. Волынец и др.



**Ключевые слова:** натюрморт, белорусский натюрморт, реминисценция, современная живопись, постмодернизм.



**Ya. Fedorets,**

*PhD in Art History, Teacher of the highest qualification category of the state Educational Institution "Children's Art School No. 3 in Vitebsk "Maladik" Vitebsk, Belarus*


## REMINISCENCES IN THE MODERN BELARUSIAN STILL-LIFE


**Abstract.** The article is devoted to the analysis of reminiscences in modern paintings on the example of still-lifes by Belarusian artists, that were made in the 2000s – early 2020s. The research will allow us to reveal in more detail the features and pattern of the manifestation of this technique in the figurative and plastic structure of the painting, the worldview of painters in postmodernism. The author